В статье приводится техническая характеристика Jetson TX1: компьютер размером с пластиковую карту имеет высокую производительность, модули Wi-Fi, Ethernet, а также 4 ГБ оперативной памяти и 16 ГБ памяти для хранения данных.

По мнению президента компании, появление компьютеров с возможностью самообучаться, писать программный код и мыслить, произведет революцию в области веб-сервисов.

Джен-Сан Хуан отметил, что новое ПО способно значительно упростить и ускорить внедрение машинного обучения на практике.

В заключение говорится, что в продаже устройство должно появиться в ближайшее время.

*5) Выделите в реферате основные элементы:* вступление, основную часть и заключение.

---

***Каляда К. В. (Мінск, Беларусь)***

## ВОБРАЗ МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў ЛІРЫЦЫ МАКСІМА ТАНКА: СПЕЦЫФІКА ЎВАСАБЛЕННЯ

*Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.*

Тэма малой радзімы, нарачанскай зямлі – адна з магістральных у паэзіі Максіма Танка. Яго творчасць увабрала ў сябе адметнасць народнага светабачання і светаразумення, спецыфічны дух мовы, фалькларызм, народную памяць, тыповы для ўзбярэжжа Нарачы беларускі пейзаж – імшыстыя ўзгоркі, карабельныя сосны, спрадвечныя валуны, імклівыя рэкі, чысцюткія азёры, салёны мядзельскі вецер.

Славуты нарачанскі край… Усё тут тыповае для Беларусі: клімат, прырода, ландшафт. Але ёсць і нешта невыказальна-чароўнае, што асабліва вабіць, захапляе прыгажосцю і пяшчотай, уражвае глыбокай філасофіяй існавання.

Нарачанская зямля ўваходзіць у свет паэзіі М. Танка праз вершы «Мядзельскі вецер», «Парог, вычасаны з успамінаў…», «Імглой», «Пад мачтай», «У азёрнай старонцы маёй», «Зара над Нараччу», «На хвалях азёр», паэму «Нарач» і інш.

Канцэпт «малая радзіма» складаецца ў М. Танка з наступных вобразных дамінант: возера, сасна, бярозы ля студні, наднарачанскія зоры і аблокі, дарога, што вядзе дадому, якая не толькі калыхала маленства будучага паэта, але і звязвала свет паэта з бацькоўская зямлёй, лёсам і вечнасцю. Вобразныя дамінанты танкаўскай паэзіі яднаюць зямное і нябеснае, канкрэтнае і агульназначнае. Як заўважае літаратуразнаўца Л. Гарэлік, «мастацка-вобразная сістэма, створаная М. Танкам, вылучаецца і касмаганічнасцю, і прадметна-побытавымі рэаліямі. Раўнапраўныя «суразмоўцы» паэта, побач з чалавекам, – нябесныя свяцілы, з'явы жывой і нежывой прыроды. Умоўна-асацыяцыйны падтэкст ствараецца з дапамогай метафарычнасці, здольнай паяднаць далёкае і блізкае, зямное і касмічнае» [1, с. 9].

Любоў да малой радзімы пачыналася ў М. Танка з парога як сакральнага сімвала, што з'ядноўвае мінулае і будучыню, з'яўляеца мяжой аднячасна і сталення (сыходу ў вялікі свет), і вяртання да жменькі роднай зямлі, шуму Нарачы, шэлесту дубровы: «Парог, вычасаны з успамінаў, / Астаўся за мной; / Дзверы, на завесах цвыркуновай песні, / Асталіся за мной; / Вокны, зашклёныя вачамі блізкіх, / Асталіся за мной; / Хата, пакрытая крыламі ластавак, / Асталася за мной, – / Як жа мне не азірнуцца назад, / Нават калі б я застыў / Слупом солі?» [3, с. 100]. Верш уяўляе сабой узор патрыятычнай лірыкі. Ён пра невымерную любоў да роднага кута, сваёй бацькаўшчыны, радзімы. У вершы спалучаюцца рытміка-інтанацыйныя магчымасці верлібра і яскравая асацыятыўная вобразнасць («парог, вычасаны з успамінаў», «вокны зашклёныя вачамі блізкіх», «хата, пакрытая крыламі ластавак» і г.д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адным з самых яскравых вобразаў у вершах пра малую радзіму стаў вобраз азёрных шаляў, якія аб’ядноўваюць азёры і рэкі, неба і зямлю, паветраную і водную стыхіі: «І так хістаюцца шалі азёр / Ад хмар і вясёлак, / Ад сонца і зор. / Колькі разоў на гэтых шалях / Узважваліся / І маё сэрца і маі песні!» [3, с. 225].

«Радзіма, – як слушна падкрэслівае даследчыца А. Жардзецкая, – для паэта не толькі прырода роднага краю, краса яго лясоў і рэчак, лугоў і палёў. Радзіма – гэта найперш людзі, шчырыя і сумленныя працаўнікі, землякі пісьменніка, на якіх трымаецца свет. Максім Танк умее дакладна і псіхалагічна тонка раскрыць іх няпросты лёс, паказаць духоўную прыгажосць. Усё, што звязана з народным жыццём, памяццю, народнай этыкай і мараллю, набывае ў яго вершах асабліва глыбокі сэнс («Вучыўся ў іх плесці лапці, араць, засяваць загоны і з сосен, смалістых, гонкіх, трывалыя зрубы стаўляць...»). Талент паэта, яго моц і глыбіня, выявіліся ў вершах «Гісторыя вёскі Пількаўшчына», «Вёска мая», «Ля старой хаціны», «Пра філосафаў», «Сямейны фотаздымак», «У гэты дзень» і інш., у якіх ён пераасэнсоўваў маральна-этычныя і духоўныя каштоўнасці, набытыя нашым народам» [2, с. 69].

Такім чынам, вобраз малой радзімы ў паэзіі М. Танка аб’ёмны і шматмерны, створаны пры дапамозе какрэтна-паняційных вобразаў (азёры, парог, бярозы, сосны, дарога, жыта і інш.). Паэзія М. Танка – гэта прызнанне ў любові да бацькоўскай зямлі і людзям, што яе насяляюць.

## ЛІТАРАТУРА


1. Гарэлік, Л. «Зямля мая, любоў мая...»: развагі пра творчасць Максіма Танка / Л. Гарэлік // Роднае слова. – 2002. – С. 5–10.
2. Жардзецкая, А. У. «Шчаслівы, што пяю цябе, Радзіма...»: вобраз Бацькаўшчыны ў паэзіі Максіма Танка / А. У. Жардзецкая // Восьмыя Танкаўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 13–14 верас. 2012 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал. Старычонак В. Д. [і інш.] ; адк. рэд. Старычонак В. Д. – Мінск, 2012. – С. 68–72.
3. Танк, М. «Мне пару крыл дало юнацтва...» : выбр. лірыка / М. Танк. – Мінск : Маст. літ., 2003. – 479 с.



***Калядка С. У. (Мінск, Беларусь)***


# ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫ СВЕТ ПАЭЗІІ МАКСІМА ТАНКА

Згадваецца прызнанне Максіма Танка з дзённікаў ад 20.08.1986: «Усё жыццё стараўся нікога не паўтараць, не наследаваць, хоць не заўсёды мне гэта ўдавалася. Таму і не стараўся, каб нехта паўтараў мяне, бо ў любой засені нават трава не расце. Сваёй кананізацыяй любых формаў і стыляў мы іх даводзім да дыскрэдытацыі» [1, с. 507]. Калі сказаць крыху перайначана, нельга быць у мастацкай сістэме і быць цалкам вольным ад яе. У маладога Максіма Танка, які быў захоплены польскай і рускай літаратурай, знойдзем шмат запазычванняў ад польскіх паэтаў, У. Маякоўскага і С. Ясеніна, якіх ён вельмі любіў. У дзённіках за 04.10.1994 быў наступны запіс: «Вельмі шмат сустракаю ў паэзіі запазычанасцяў, наследаванняў. Але што з гэтага дзівіцца, калі недзе чытаў – яшчэ сапернікі Мікеланджэла Рафаэль і Брамантэ, маючы ключы ад Сікстынскай капэлы, прыходзілі запазычыць мікеланджэлаўскія ўзоры» [1, с. 733–734]. Безумоўна, кожнаму мастаку хочацца быць унікальным, непаўторным, асобай, якая прадвызначае тэндэнцыі ў развіцці мастацтва, а не сляпым пераймальнікам, імітатарам, падобным на многіх іншых.

Усё жыццё Максім Танк шукаў у рэчаіснасці такія сэнсы, якія, зафіксаваныя ў слове, змаглі б перайначыць чалавека і свет. З аднаго боку, ён імкнуўся да таго, каб



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ